Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Прывітанне з Беларусі!»

14 ліпеня 2020 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Прывітанне з Беларусі!», наклад якой складзе 60 тысяч.

Дызайн паштовай маркі, спецштэмпеля і канверта «Першы дзень» Марыны Юрчык.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Падрабязнасці на сайце РУП «Белпошта» ў раздзеле Філатэлія

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/13-07-2020-6591*